2 (199)

ЛЮТЫ

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221
ад 14 студзеня 2013 г.

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

Заснавальнікі:
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Пачатковая школа", дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч

Рэдакцыйная калегія:
Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часнуоўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.

Рэдакцыйная рада:
Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан (старшыня рады), Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Аляксандр Корзюк, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.

Рэдакцыя:
Намеснік галоўнага рэдактара — Наталля Матусевіч, рэдактар аддзела — Надзея Кушнер, мастацкае афармленне — Уладзімір Малахаў, вёрстка — Надзея Пяткоўская, карэктура — Людміла Шчэрба.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЗМЕСТ

Слова ад рэдакцыі 3

САЦЫЯЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

Аляксандр Каханоўскі — Эвалюцыя саслоўна-прававога становішча мяшчан Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. 5

ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ

Анатоль Вялікі — Мінскі адкрыты судовы працэс 1946 года над нямецка-фашысцкімі злачынцамі 14

ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

Валянцін Голубеў — Агляд беларускай гістарыяграфіі гісторыі Вялікага Княства Літоўскага (канец XX — пачатак XXI ст.). Аграрная гісторыя 22

ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

Любоў Уладыкоўская — Беларускія колеры міжкультурнага дыялогу 31

**Анатоль ВЯЛІКІ**

# Мінскі адкрыты судовы працэс 1946 года над нямецка-фашысцкімі злачынцамі

*70 гадоў таму, у канцы студзеня 1946 г., у Мінску адбыўся судовы працэс па справе аб злачынствах, якія здзейснілі нямецка-фашысцкія захопнікі на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг. На лаве падсудных апынуліся 18 чалавек, якія былі прыгавораныя да пакарання.*

Адным з самых страшных і трагічных вынікаў Вялікай Айчыннай вайны для Беларусі сталі людскія страты. З першых дзён вайны нямецка-фашысцкія захопнікі, выконваючы план "Ост", праводзілі палітыку генацыду адносна ўсяго насельніцтва Беларусі. Сродкі яе былі розныя: расстрэлы, павешанні, катаванні людзей у лагерах і турмах, знішчэнне падчас карных аперацый, прымусовы вываз савецкіх грамадзян у Германію. Непасрэднымі выканаўцамі масавага знішчэння людзей з'яўляліся войскі СС, каманды СД, паліцэйскія і жандарскія падраздзяленні, ахоўныя і франтавыя часці вермахта.

Кіраўніцтва Савецкага Саюза практычна з першых дзён вайны атрымлівала інфармацыю аб злачынствах на акупаванай тэрыторыі, аднак пакараць вінаватых у той момант не магло. Галоўнай задачай з'яўлялася вызваленне акупаванай тэрыторыі, дасягненне перамогі, пасля чаго можна было пачынаць пераслед ваенных злачынцаў. Разам з тым ужо ў пачатку вайны савецкае кіраўніцтва распаўсюдзіла па дыпламатычных каналах з мэтай інфармавання краін антыгітлераўскай кааліцыі доказы злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на акупаванай тэрыторыі. У дыпламатычных нотах Наркамата замежных спраў СССР "О возмутительных зверствах германских властей в отношении советских военнопленных" ад 25 снежня 1941 г., "О повсеместных грабежах, разорении населения и чудовищных зверствах германских властей на захваченной ими территории" ад 6 студзеня 1942 г., "О чудовищных злодеяниях, зверствах и насилиях немецко-фашистских захватчиков в оккупированных советских районах и об ответственности германского правительства и командования за эти преступления" ад 27 красавіка 1942 г.[1], заяве савецкага ўрада "Об ответственности гитлеровских захватчиков и их сообщников за злодеяния, совершаемые в оккупированных странах Европы" ад 14 кастрычніка 1942 г.[2] не толькі адзначаліся факты злачынстваў, але і падкрэслівалася непазбежнасць крымінальнай адказнасці за іх здзяйсненне.

Упершыню гэтае пытанне пачало абмяркоўвацца на міжнародным узроўні напярэдадні Маскоўскай канферэнцыі міністраў замежных спраў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі. 13 кастрычніка 1943 г. прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі У.Чэрчыль накіраваў І.Сталіну пасланне, у якім паведамляў, што Вялікабрытанія,



***ВЯЛІКІ Анатоль Фёдаравіч.***

*Загадчык кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1956 г. у в. Бушацін Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці. У 1982 г. закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М.Горкага, працаваў на розных пасадах. У 2001 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Абмен насельніцтвам паміж БССР і Польшчай. 1944—1946 гг.". Даследуе гісторыю беларуска-польскіх, польска-беларускіх узаемаадносінаў у XX ст., гісторыю архіваў і архіўнай справы ў Беларусі. Аўтар манаграфій "На раздарожжы. Беларусы і палякі ў час перасялення (1944—1946 гг.)" (Мн., 2005), "Беларусь — Польшча. Невядомая рэпатрыяцыя. 1955—1959 гг." (Мн., 2007), "Беларусь у савецка-польскіх міждзяржаўных адносінах. 1944—1959 гг." (Мн., 2009), больш за 120 навуковых публікацый.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЗША і Савецкі Саюз атрымалі з розных крыніц звесткі аб масавых злачынствах гітлераўскіх узброеных сіл у многіх краінах. Далей была выказана прапанова, каб тры саюзныя дзяржавы прынялі дэкларацыю, у якой неабходна адзначыць, што *"все германские офицеры и солдаты и члены нацистской партии, которые были ответственны за вышеупомянутые зверства, убийства и казни или добровольно приняли в них участие, будут отосланы в страны, в которых были совершены ими эти отвратительные действия, для того, чтобы они могли быть судимы и наказаны в соответствии с законами этих освобожденных стран и свободных правительств, которые будут там созданы. Списки будут составлены со всеми возможными подробностями, полученными от всех этих стран, в особенности с учетом оккупированных частей России* (Савецкага Саюза. — **А.В.**), *Польши, Чехословакии, Югославии и Греции, включая Крит и другие острова, Норвегии, Дании, Нидерландов, Бельгии, Люксембурга, Франции и Италии. [...] Таким образом, немцы, которые принимают участие в массовых расстрелах [...], которые принимали участие в истреблении, которому был подвергнут народ Польши, или в истреблении населения на территориях Советских Республик, которые нынче очищаются от врага, должны знать, что они независимо от расходов будут отправлены в места, где ими были совершены преступления, и будут судимы на месте народами, над которыми они совершали насилия. Пусть те, кто еще не обагрил своих рук невинной кровью, будут предупреждены с тем, чтобы они не оказались в числе виновных, ибо три союзные державы наверняка найдут их даже на краю света и выдадут их обвинителям, с тем, чтобы могло совершиться правосудие"*[3].

Прапанова У.Чэрчыля, падтрыманая І.Сталіным і Ф.Рузвельтам, была прынятая на Маскоўскай канферэнцыі (19—30 кастрычніка 1943 г.) як "Декларация об ответственности гитлеровцев за совершаемые зверства". У дакуменце падкрэслівалася: *"Эта Декларация не затрагивает вопроса о главных преступниках, преступления которых не связаны с определенным географическим местом и которые будут наказаны совместным решением правительств союзников"*[4]. У Савецкім Саюзе гэтая дэкларацыя ўпершыню была надрукаваная ў газеце "Правда" ад 2 лістапада 1943 г.

З ажыццяўленнем карэннага пералому ў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў справа пакарання нацысцкіх злачынцаў перайшла ад дэкларатыўных заяў да практычнай рэалізацыі. На вызваленай тэрыторыі СССР пачалі праводзіць адкрытыя судовыя працэсы над ваеннымі злачынцамі і іх памагатымі. Першымі такімі працэсамі сталі Краснадарскі працэс у ліпені 1943 г., Краснадонскі ў жніўні 1943 г., Харкаўскі і Смаленскі ў снежні 1943 г. Яны шырока асвятляліся ў перыядычным друку Савецкага Саюза і атрымалі гучны рэзананс у грамадстве.

Ва ўмовах ваеннага часу выпрацоўвалася і нарматыўна-прававая база, у адпаведнасці з якой судзілі ваенных злачынцаў. У лістападзе 1942 г. у СССР была ўведзена крымінальная адказнасць для нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх памагатых за здзяйсненне на акупаванай тэрыторыі такіх злачынстваў, як забойствы і катаванні мірных жыхароў, прымусовы вываз савецкіх грамадзян у іншаземнае рабства, рабаўніцтва насельніцтва і вываз у Германію асабістай маёмасці грамадзян (а таксама калгаснай і дзяржаўнай маёмасці), разбурэнне помнікаў мастацтва і культуры народаў Савецкага Саюза, раскраданне мастацкіх і гістарычных каштоўнасцяў[5].

19 красавіка 1943 г. быў прыняты Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР "О мерах наказания для немецко-фашистских злодеев, виновных в убийствах и истязаниях советского гражданского населения и пленных красноармейцев, для шпионов, изменников родины из числа советских граждан и для их пособников", у якім адзначалася, што *"[...] немецкие, итальянские, румынские, венгерские, финские фашистские злодеи, уличенные в совершении убийств и истязаний гражданского населения и пленных красноармейцев, а также шпионы и изменники родины из числа советских граждан караются смертной казнью через повешение. [...] Повешение осужденных к смертной казни — производить публично, при народе, а тела повешенных оставлять на виселице в течение нескольких дней, чтобы все знали, как караются и какое возмездие постигнет всякого, кто совершает насилие и расправу над гражданским населением и кто предает свою родину"*[6]. Сярод арыштаваных і асуджаных ваеннапалонных і грамадзянскіх асобаў гэты прававы акт быў вядомы як Указ 43. У адпаведнасці з ім акрамя смяротнага пакарання прымянялася высылка на катаргу тэрмінам ад 15 да 25 гадоў. Для асуджаных на катаржныя работы прадугледжваліся спецыяльныя месцы зняволення.

Заўважым, што савецкая практыка крымінальнага пераследу за ваенныя злачынствы прадугледжвала адказнасць і тых асобаў, хто выконваў злачынствы па загадах ваеннага камандавання, знаходзячыся на службе ў ваенных часцях, паліцэйскіх і жандарскіх фарміраваннях, структурах акупацыйнай адміністрацыі.

Падавалася, што і ў вызваленай у ліпені 1944 г. Беларусі павінен адбыцца працэс над ваеннымі злачынцамі. Аднак самастойна прыняць рашэнне аб яго правядзенні партыйна-савецкае кіраўніцтва рэспублікі не магло. Трэба было чакаць адпаведнага рашэння Масквы. У сваю чаргу насельніцтва Беларусі патрабавала пакарання ваенных злачынцаў. У вызваленых гарадах і мястэчках праходзілі мітынгі, на якіх прымаліся адпаведныя рэзалюцыі. Так, напрыклад, з нагоды вызвалення Магілёва 9 ліпеня 1944 г. адбыўся ўрачысты мітынг, дзе быў прыняты зварот грамадзян да ваеннага савета 2-га Беларускага фронта (войскі якога вызвалялі горад), у якім падкрэслівалася: *"Мы никогда не забудем, никогда не простим гитлеровским преступникам их черные злодеяния. Это они, гады, насильственно угнали в свое фашистское логово тысячи людей, расстреляли, отравили в душегубках, замучили голодной смертью и пытками де-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




*Абвінаваўчыя справы на падсудных.*

*сятки тысяч лучших сынов города и военнопленных, тела которых зарыты на аэродроме в районе Луполова, у авторемзавода, Дубровенки, Пашкова, Палынковичи, чтобы скрыть следы своих гнусных преступлений, фашистские людоеды отрывали трупы убитых и сжигали, но никакие увертки не спасут мерзавцев от правосудия. Настало время отвечать"*[7].

Вызваленыя вязні з лагера "Азарычы" ў пачатку красавіка 1944 г. накіравалі ліст на імя І.Сталіна, у якім заклікалі *"воинов Красной Армии, партизан и партизанок, наших сыновей, отцов, братьев — отомстить за нас, беспощаднее громить, уничтожать немецких душегубов как бешеных собак, как выродков Гитлера, этого исчадия ада. Смерть и мщение немецким захватчикам"*[8].

Правядзенне падліку страт і складанне спіса асобаў, якія здзейснілі злачынствы на тэрыторыі Беларусі, былі ўскладзеныя на Рэспубліканскую дзяржаўную надзвычайную камісію па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў (РДНК), а таксама на адпаведныя абласныя камісіі. Апошнія перадавалі спісы злачынцаў органам контрразведкі Смерш, Народнага камісарыята дзяржаўнай бяспекі (НКДБ), Народнага камісарыята ўнутраных спраў (НКУС), Ваеннай пракуратуры, якія займаліся пошукам абвінавачваемых у лагерах для нямецкіх ваеннапалонных на тэрыторыі СССР і ў еўрапейскіх краінах, іх перамяшчэннем у Мінск, правядзеннем допытаў і прад'яўленнем абвінавачанняў.

Напрыклад, начальнік упраўлення контрразведкі Смерш Мінскай ваеннай акругі паведамляў сакратару РДНК В.Яшумаву аб тым, што *"Главным управлением контрразведки НКО "СМЕРШ" арестован комендант Главной полевой комендатуры № 392, действовавшей на территории Белоруссии, генерал-майор немецкой армии фон Чаммер унд Остен Эккер, который в советской прессе объявлен как преступник войны. Прошу Вашего распоряжения о высылке всех имеющихся у Вас материалов, относящихся к деятельности фон Чаммера"*[9]. Аднак даных аб злачынствах фон Чамера на тэрыторыі рэспублікі не мелася, таму яго этапавалі ў Кіеў. Там на судовым працэсе фон Чамер праходзіў як адзін з абвінавачваных і быў асуджаны да вышэйшай меры пакарання праз павешанне[10].

Пошукам ваенных злачынцаў займаліся і органы Смерш франтоў, якія вызвалялі Беларусь. Так, начальнік упраўлення контрразведкі Смерш 1-га Прыбалтыйскага фронту М.Ханнікаў даслаў 14 лютага 1944 г. першаму сакратару ЦК КП(б)Б П.Панамарэнку ліст, у якім паведамляў, што *"Управлением контрразведки "СМЕРШ" 1-го Прибалтийского фронта принятыми мерами розыска установлены и арестованы ряд лиц-изменников Родины, принимавших участие в злодеяниях, творимых немцами над советскими гражданами [...] в г. Городок и Городокском районе"*[11].

Такім чынам, да пачатку Мінскага працэсу ў Савецкім Саюзе ўжо быў назапашаны вопыт правядзен-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

ня падобных працэсаў і вызначаная іх прававая база. У студзені 1946 г. працэсы над ваеннымі злачынцамі адбыліся ў Нікалаеве (10—17 студзеня), Мінску (15—30 студзеня), Кіеве (17—29 студзеня), Вялікіх Луках (24—31 студзеня), Рызе (26 студзеня — 2 лютага).

Рашэнне аб правядзенні Мінскага адкрытага судовага працэсу было прынята ў Маскве ў сярэдзіне снежня 1945 г. У тэлеграме з Масквы, адрасаванай наркаму ўнутраных спраў БССР С.С.Бельчанку, наркаму дзяржбяспекі БССР Л.Ф.Цанаве, начальніку ўпраўлення контрразведкі Смерш Беларускай ваеннай акругі Ярмоліну, пазначалася: *"согласно решению директивных органов, в Минске будет проведен открытый процесс над группой изобличенных в зверствах против советских граждан бывших военнослужащих германской армии и немецких карательных органов. По Минску намечено 17 преступников. Срок окончания следствия определен 10.01.1946 г. Судебный процесс должен быть начат 15.01.1946 г."*[12]. У гэтай жа тэлеграме паведамлялася, што старшынёй суда прызначаецца генерал-лейтэнант юстыцыі М.Кедраў (старшыня ваеннага трыбунала Баранавіцкай ваеннай акругі), дзяржаўным абвінаваўцам — генерал-маёр юстыцыі Л.Ячэнін (ваенны пракурор акупацыйных войскаў у Германіі). Для дапамогі ў правядзенні працэсу ў Мінск была камандзіраваная група кваліфікаваных аператыўных работнікаў НКУС, НКДБ СССР і Галоўнага ўпраўлення контрразведкі Смерш. Абарону падсудных павінны былі весці восем адвакатаў, якіх папярэдне адабралі на працэс.

20 снежня 1945 г. бюро ЦК КП(б)Б прыняло пастанову "О судебном процессе в г. Минске над 18 немецко-фашистскими преступниками"[13]. (Звернем увагу на той факт, што ў Маскве прынялі рашэнне аб пакаранні 17 злачынцаў, а ў пастанове бюро ЦК КП(б)Б гаворка ўжо ідзе пра 18 чалавек. Пакуль невядома, хто прыняў рашэнне аб уключэнні ў лік падсудных яшчэ аднаго чалавека.) У адпаведнасці з гэтай пастановай судовы працэс павінен быў адбыцца з 15 па 30 студзеня 1946 г. у Доме афіцэраў Мінскай ваеннай акругі. С.Бельчанку і Л.Цанаве даручалася падрыхтаваць да судовага працэсу залу, арганізаваць яе ахову, а таксама забяспечыць ахову ўсім сведкам, якія прыбудуць на працэс. Мінскаму гарадскому савету даручалася падрыхтаваць у гасцініцах Мінска 100—150 пакояў для сведак, адвакатаў, экспертаў, журналістаў і іншых удзельнікаў судовага працэсу. Сакратару ЦК КП(б)Б Ц.Гарбунову даручалася арганізаваць шырокае асвятленне падзей у рэспубліканскім перыядычным друку і праз радыё.

**Падсудныя.** На лаве падсудных апынуліся: генерал-лейтэнант германскай арміі *Іаган Рыхерт* (былы камандзір 286-й ахоўнай дывізіі і 35-й пяхотнай дывізіі), генерал-маёр паліцыі, брыгадэнфюрэр СС *Эбергарт Герф* (былы начальнік паліцыі Беларусі і намеснік начальніка галоўнага штаба па барацьбе з партызанамі), генерал-маёр *Готфрыд Эрмансдорф* (былы камендант Магілёва і Магілёўскага ўмацаванага раёна), падпалкоўнік паліцыі *Георг Вайсіг* (былы камандзір 26-га паліцэйскага палка), капітан паліцыі *Эрнст Фальк*



*Абвінавачваныя на лаве падсудных.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



*Старшыня на судовым працэсе генерал-маёр М.Кедраў зачытвае абвінаваўчае заключэнне.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(былы камандзір батальёна 26-га паліцэйскага палка), маёр *Рэйнгард Мол* (былы камендант Бабруйска і м. Парычы), капітан *Карл Лангут* (былы намеснік лагера №131 у Бабруйску), обер-лейтэнант СС, крымінал-камісар гестапа *Ганс Кох* (былы начальнік паліцыі бяспекі ў Арле, Оршы, Барысаве і Слоніме), *Роль Бурхарт* (зондэрфюрэр Бабруйскай камендатуры), лейтэнант *Аўгуст Бітнер* (зондэрфюрэр, былы камендант сельскагаспадарчай камендатуры Бабруйскага раёна), капітан *Бруна Гетцэ* (былы намеснік каменданта Бабруйскай камендатуры), капітан *Паўль Айк* (былы намеснік каменданта Оршы), *Бруна Мітман* (былы вахмістр раённай жандармерыі Мінска), *Франц Гес* (былы унтэр-афіцэр часцей СС, паліцыі бяспекі і аховы парадку СД у Мінску), *Ганс Фішар* (обер-яфрэйтар штаба 8-й кавалерыйскай дывізіі СС "Мертвая галава"), *Ганс Хехтль* (былы яфрэйтар 718-га палявога вучэбнага палка), *Алоіз Гетэрых* (былы салдат 359-га палка), *Альберт Родэнбуш* (былы салдат 635-га вучэбнага палка).

Усе яны рознымі шляхамі трапілі ў Мінск у якасці абвінавачваных. Так, Г.Эрмансдорф быў захоплены ў палон 28 чэрвеня 1944 г. пасля капітуляцыі Магілёўскага ўмацаванага раёна і знаходзіўся ў лагеры ваеннапалонных у СССР[14]. Э.Герф быў арыштаваны ўпраўленнем контрразведкі Смерш у Празе і адтуль этапаваны ў Мінск. Г.Кох быў узяты ў палон вясной 1945 г. у Германіі амерыканскімі злучэннямі, потым перададзены савецкай ваеннай адміністрацыі ў Германіі і затым прывезены ў Мінск. Усе падсудныя абвінавачваліся ў арганізацыі масавага знішчэння савецкіх грамадзян, угоне насельніцтва на работы ў Германію, разбурэнні гарадоў, вёсак, прамысловых прадпрыемстваў і іншых злачынствах.

Выклікае пытанне, хто і зыходзячы з якіх меркаванняў вызначаў асобы і колькасць падсудных на Мінскім працэсе. У пэўнай ступені можна казаць пра іх "выпадковасць". Многія злачынцы на тым працэсе перад судом не паўсталі. Так, напрыклад, упраўленнем контрразведкі Смерш Паўднёвай групы войскаў Чырвонай арміі 24 ліпеня 1944 г. былі арыштаваныя аўстрыйцы Э.Фрыдл, І.Айгеман, К.Бюхнер, І.Руіс, І.Карнер, якія ў 1942—1944 гг. служылі ў паліцыі бяспекі і аховы парадку СД у Беларусі і *"[...] принимали участие в массовом истреблении советских людей в специальных машинах (душегубках). Таким образом, ими было умерщвлено в районе г. Минска до 25—30 тыс. советских граждан"*[15]. Аднак іх на працэсе ў якасці падсудных не было. У той жа час І.Гетэрых, які апынуўся на працэсе ў Мінску, знаходзіўся на тэрыторыі Беларусі ўсяго толькі 28 дзён і, як адзначыў яго адвакат, яго віна ў параўнанні з іншымі падсуднымі была найменшая[16].

**Сведкі.** У якасці сведак на працэс было запрошана 50 чалавек, сярод якіх — вядомая падпольшчыца Алена Мазанік[17]. Аднак суд палічыў неабходным дадаткова запрасіць яшчэ 6 чалавек. Такім чынам, на працэсе выступілі 56 сведак. Нягледзячы на вельмі сціслыя тэрміны правядзення следства, усе сведкі праходзілі папярэднія апытанні, а іх паказанні далучаліся да следчых матэрыялаў па кожным падсудным.

Па нацыянальнай прыналежнасці сведкі размяркоўваліся наступным чынам: 50 чалавек — беларусы, тры — яўрэі, адзін — украінец, адзін — рускі, адзін — казах. Толькі адзін са сведак быў ваеннапалонны — У.Багданчук, які разам з іншымі палоннымі чырвонаармейцамі быў этапаваны з лагера ваеннапалонных у Чарнігаве ў Бабруйскі лагер ваеннапалонных. Сярод сведак было чацвёра праваслаўных святароў,

якія падчас вайны вялі душпастырскую дзейнасць у храмах, якія дазволілі адкрыць немцы — у Магілёве, Шклове, Вілейцы, вёсцы Пеўцы Полацкай вобласці.

Таксама ў лік сведак былі ўключаныя людзі, якія, паводле савецкай тэрміналогіі, з'яўляліся калабарантамі. У стэнаграме працэсу, напрыклад, можна сустрэць інфармацыю, што ў зале пачаўся гул, калі ў якасці сведкі была выклікана Валянціна Р., якая ў 1943—1944 гг. працавала перакладчыцай у камендатуры Шклова.

Геаграфічна сведкі прадстаўлялі амаль усю Беларусь (за выключэннем Брэсцкай і Пінскай абласцей). Разам з тым найбольшая іх колькасць паходзіла з Мінскай і Бабруйскай абласцей — па 15 чалавек, ад Маладзечанскай вобласці было 6 чалавек, астатнія прадстаўлялі іншыя вобласці рэспублікі. 36 сведак былі мужчыны, 20 — жанчыны.

На працэсе былі агучаны лічбы аб стратах Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, якія ў далейшым цвёрда замацаваліся ў айчыннай гістарыяграфіі і застаюцца пануючымі да цяперашняга часу. Так, у абвінаваўчым заключэнні адзначалася: *"Как установлено Чрезвычайной Государственной Комиссией по расследованию злодеяний, немецко-фашистские захватчики истребили свыше 2 200 000 мирных советских граждан и военнопленных, угнали в немецкое рабство около 380 тысяч человек, разрушили и сожгли 209 городов, в том числе столицу белорусского народа – город Минск, города Гомель, Полоцк, Витебск, Орша, Борисов, Слуцк и многие другие и 9200 сел и деревень; разрушили и вывезли в Германию 10 338 промышленных предприятий; разрушили и разграбили 10 000 колхозов, 92 совхоза: отобрали и угнали в Германию 2 800 000 голов крупного рогатого и 5 700 000 голов мелкого скота; уничтожили 1136 больниц, поликлиник, амбулаторий, 1985 театров, клубов, школ, высшие учебные заведения и музеи"*[18].

**Ход працэсу.** Пачаўся працэс 15 студзеня 1946 г. з працэдурных пытанняў: устанаўленне асобаў падсудных, паведамленне ім, што яны абвінавачваюцца ў злачынствах, якія прадугледжаныя часткай 1-й Указа Прэзідыўма ВС СССР ад 19 красавіка 1943 г. (*"1. Установить, что немецкие, итальянские, румынские, венгерские, финские фашистские злодеи, уличенные в совершении убийств и истязаний гражданского населения и пленных красноармейцев, а также шпионы и изменники родины из числа советских граждан, караются смертной казнью через повешение"*), паведамленне аб наяўнасці на працэсе сведак, перакладчыкаў, адвакатаў. Ф.Гес адмовіўся ад адваката і заявіў, што будзе абараняць сябе сам. На гэтым жа пасяджэнні з абвінаваўчым заключэннем (якое было зацверджана Ваенным трыбуналам Мінскай ваеннай акругі 13 студзеня 1946 г., г. зн. за два дні да пачатку працэса) выступіў маёр юстыцыі Іваноў.

Абвінавачанне падсудных, зачытанае на вечаровым пасяджэнні ў першы дзень працэса, 15 студзеня, уключала чатыры раздзелы: "Знішчэнне мірных савецкіх грамадзян", "Зверскія расправы і здзекі над савецкімі ваеннапалоннымі", "Масавы ўгон грамадзянскага насельніцтва ў нямецкую няволю", "Разбурэнні гарадоў, вёсак і рабункі мірнага насельніцтва". Кожны раздзел змяшчаў інфармацыю, якая пацвярджалася шматлікімі дакументальнымі сведчаннямі, экспертнымі заключэннямі, вынікамі працы абласных камісій садзейнічання працы РДНК і г.д. Так, напрыклад, па першым раздзеле адзначалася: *"В лагерях смерти, находившихся в Озаричах Полесской области, умерщвлено 8000 мирных советских граждан посредством расстрелов и заражения сыпно-тифозными заболеваниями. В лагерях Полоцка погибло от голода, холода и расстрелов 33 000 военнопленных, трупы которых сваливались в ров, где они обливались горючим и сжигались. В районе деревни Малый Тростенец Минской области немецкой тайной полицией был организован концентрационный лагерь, в котором сожжено и расстреляно свыше 120 000 мирных советских граждан. В лагерях Гомельской области уничтожено 53 630 советских граждан еврейской национальности, в том числе около 2 тысяч детей"*[19].

З 16 па 26 студзеня праходзілі допыты падсудных і апытанні сведак. Кожнаму абвінавачванаму былі прад'яўленыя канкрэтныя факты яго злачыннай дзейнасці. Прывядзем адзін з такіх фактаў. Пракурор запытаў Б.Мітмана: *"Вы расстреляли в совхозе Вишневка Тарасевич с ребенком, Гулис с ребенком и еще 7 человек неизвестных вам по фамилии?* ***Митман:*** *Да.* ***Прокурор:*** *За что вы их расстреляли?* ***Митман:*** *Потому что они были заподозрены в связи з партизанами.* ***Прокурор:*** *А дети Гулис и Тарасевич тоже были связаны с партизанами?* ***Митман:*** *Такой существовал порядок и приказ, чтобы вместе с родителями расстреливать и детей"*[20]. Б.Мітман таксама прызнаўся, што ўдзельнічаў у расстрэле 100 псіхічна хворых нацыстаў у бальніцы ў Навінках.

Пасля абвінавачваных былі заслуханы сведкі. Святар Вілейскай праваслаўнай царквы Л.Бяляўскі, напрыклад, паведаміў: *"Я доложу высокому трибуналу только то, что я хорошо знаю, что я сначала проверил. В период немецкой оккупации территории Белоруссии я проживал в Вилейке и, как местный священник, имел широкое общение с духовенством Вилейской области. Отношение оккупационных властей к трудящемуся населению города Вилейки и области можно назвать жестоким и бесчеловечным. Это отношение воскрешает в памяти мрачный период, когда, с одной стороны, царило полное правовое бессилие и беззащитность, а с другой, безграничное насилие и безнаказанность. [...] Другой известный мне случай массового уничтожения мирного населения имел место в конце ноября 1942 г. Тогда на двух грузовых машинах из Вилейской тюрьмы были привезены в деревню Порса около 150 человек арестованных и живыми сожжены в бане, принадлежавшей гражданину Черепанову А.Д. В тех же числах было произведено сожжение живыми более 300 заключенных Вилейской тюрьмы в деревне Глинное, в 5 километрах от Вилейки, по дороге на Молодечно. Как и в первом, так и во втором случае были жертвам дети, мужчины и женщины всех национальностей"*[21].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вечарам 27 студзеня абвінаваўчае заключэнне зачытаў дзяржаўны абвінаваўца генерал-маёр юстыцыі Л.Ячэнін, які падкрэсліў: *"Вина всех подсудимых по настоящему делу неопровержимо доказана материалами дела, актами Чрезвычайной Государственной Комиссии, показаниями множества свидетелей. [...] Товарищи судьи. Вашего сурового приговора злодеям ждет весь белорусский народ, который прожил три страшных года под властью этих извергов, который потерял сотни тысяч своих сынов и дочерей, расстрелянных, сожженных и замученных немецкими палачами, в том числе сидящими здесь на скамье подсудимых [...] Чудовищные преступления, совершенные подсудимыми, предусмотрены статьей 1-й Указа Президиума Верховного Совета СССР от 19 апреля 1943 года "О мерах наказания для немецко-фашистских злодеев, виновных в убийствах и истязаниях советского гражданского населения и пленных красноармейцев, для шпионов, изменников родины из числа советских граждан и для их пособников". На основании этого указа я, как государственный обвинитель, прошу Военный трибунал приговорить всех подсудимых к смертной казни через повешение"*[22].

28 студзеня ў абарону падсудных выступілі адвакаты, якія прасілі *"оказать при вынесении приговора возможное снисхождение"*. На вечаровым пасяджэнні 28 студзеня і ранішнім пасяджэнні 29 студзеня падсудным было дадзена апошняе слова. Кожны папрасіў, каб яго "судзілі не строга", заявіў, што раскайваецца і шкадуе аб здзейсненых злачынствах. Толькі Г.Кох не прызнаў сваю віну, заявіўшы, што застаецца верным ідэалам нацызму, і папрасіў, каб яго прысудзілі да расстрэлу.

Вечаровае пасяджэнне 29 студзеня паставіла кропку ў Мінскім працэсе. Суд не палічыў тлумачэнне аб тым, што падсудныя толькі выконвалі загады камандавання, у якасці змякчаючых віну абставінаў. Ваенны трыбунал Мінскай ваеннай акругі прызнаў усіх падсудных вінаватымі ў здзяйсненні злачынстваў, прадугледжаных артыкулам 1 Указа Прэзідыўма ВС СССР ад 19 красавіка 1943 г. Кіруючыся артыкулам 2 Крымінальнага кодэкса БССР, артыкуламі 319 і 320 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса БССР, 30 студзеня 1946 г. суд вынес прысуд. І.Рыхерт, Э.Герф, Г.Эрмансдорф, Г.Вайсіг, Э.Фальк, Г.Кох, П.Айк, К.Лангут, Б.Мітман, Ф.Гес, Р.Мол, Р.Бурхарт, А.Бітнер, Г.Фішар былі прыгавораны да смяротнага пакарання праз павешанне. Б.Гетцэ, Г.Хехтль ссылаліся на катаргу на 25 гадоў. А.Гетэрых, А.Родэнбуш ссылаліся на катаргу на 15 гадоў[23].

30 студзеня 1946 г. у 14.30 на сталічным іпадроме ў прысутнасці каля 100 тысяч чалавек прысуд Ваеннага трыбунала быў прыведзены ў выкананне.

На Мінскім адкрытым працэсе над нямецка-фашысцкімі злачынцамі быў абвінавачаны і асуджаны антыгуманны нацысцкі рэжым, тэарэтычным падмуркам якога выступаў нацыянал-сацыялізм, а таксама канкрэтныя носьбіты гэтага рэжыму — нямец-



*Пакаранне злачынцаў на мінскім іпадроме 30 студзеня 1946 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кія салдаты і генералы, якія здзейснілі на тэрыторыі Беларусі злачынствы супраць беларускага народа. На працэсе асудзілі ўсяго 18 чалавек, хоць толькі па падліках Мінскай абласной камісіі садзейнічання ў працы Рэспубліканскай дзяржаўнай надзвычайнай камісіі спіс "Немецко-фашистских преступников и их сообщников, совершивших злодеяния на временно оккупированной территории СССР" (маецца на ўвазе толькі Мінская вобласць) уключаў 261 чалавека, у тым ліку 106 нямецкіх салдат і афіцэраў[24]. Судзілі іх ці не — невядома.

Аўстрыйскі даследчык С.Карнер прыводзіць даныя, што ў Савецкім Саюзе паводле рашэнняў судоў было асуджана 37 600 ваеннапалонных, з іх каля 10 700 чалавек — у першыя гады палону і каля 26 тыс. — у 1949—1950 гг. З 1942 па 1953 гг. на адкрытых працэсах 263 чалавекі былі прысуджаныя да смяротнага пакарання праз павешанне, астатнія — да пазбаўлення волі тэрмінам да 25 гадоў[25]. У лік гэтых 263 чалавек неабходна ўключыць і 14 чалавек, якія былі павешаны 30 студзеня 1946 г. у Мінску.

Разам з тым неабходна пагадзіцца з меркаваннем беларускага даследчыка А.Шаркова, што гэта не канчатковыя даныя[26]. Праблема ўдакладнення кольскасных даных аб усіх ваенных злачынцах, якіх судзілі ў Беларусі, тэрмінаў іх зняволення, месцаў адбывання пакарання, фактаў амнісціравання і г. д. патрабуе далейшай распрацоўкі.

Неабходна звярнуць увагу на разважанні С.Карнера, які, разглядаючы суды над ваеннымі злачынцамі ў Савецкім Саюзе, адзначае, што *"процессы над военными преступниками в Советском Союзе и осуждение военнопленных и гражданских лиц по разным причинам не могут быть названы исходящими из гуманного и демократического толкования права* (выдзелена намі. — **А.В.**). *Это связано с их политической направленностью и тем, как они проводились, и с недостаточностью доказательств. [...] Без сомнения, среди осужденных были и те, которые участвовали в зверствах или же отдавали приказы об их совершении и таким образом навлекли на себя тягчайшую личную ответственность"*[27].

Безумоўна, палітычныя і ідэалагічныя складальнікі адкрытых працэсаў мелі месца. Аднак у цэлым з прыведзеным выказваннем пагадзіцца нельга. Пра якую "гуманнасць і дэмакратычнасць тлумачэння права" можна было казаць, калі вілейскі святар адносна "новага нямецкага парадку", які панаваў на беларускіх землях у час акупацыі, справядліва сказаў, што *"с одной стороны, царило полное правовое бессилие и беззащитность, а с другой — безграничное насилие и безнаказанность"*.

Адкрыты судовы працэс у Мінску над злачынствамі нямецка-фашысцкіх захопнікаў у час акупацыі ў Беларусі — гэта абгрунтаванае і заканадаўча замацаванае ў адпаведнасці з нормамі ўнутранага права СССР і міжнароднага права прымяненне крымінальнай адказнасці за злачынствы супраць чалавецтва. Гэта заслужанае пакаранне ваенных злачынстваў і злачынцаў за канкрэтнае зло, якое яны здзейснілі ў Беларусі і супраць беларускага народа.

---

[1] Хорьков В. Нацистская война на уничтожение в советских дипломатических документах // Война на уничтожение: нацистская политика геноцида на территории Восточной Европы. Материалы международной научной конференции (Москва, 26—28 апреля 2010 г.). М., 2010. С. 408-409.

[2] Преступные цели гитлеровской Германии в войне против Советского Союза: Документы и материалы / Под. ред. П.А.Жилина. М., 1987. С. 274.

[3] Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны, 1941—1945 гг.: Сборник документов. Т. I. Московская конференция министров иностранных дел СССР, США и Великобритании (19—30 октября 1943 г.). М., 1978. С. 80-81.

[4] Там жа. С. 363-364.

[5] Шаркоў А. Генералы вермахта ў палоне // Беларускі гістарычны часопіс. 2006, № 1. С.11.

[6] Указ Президиума Верховного Совета СССР от 19 апреля 1943 г. № 39 "О мерах наказания для немецко-фашистских злодеев, виновных в убийствах и истязаниях советского гражданского населения и пленных красноармейцев, для шпионов, изменников родины из числа советских граждан и для их пособников" // Рэжым доступу: http://libussr.ru/doc_ussr/ussr_4421.htm

[7] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 4п, воп. 29, спр. 7, арк. 51.

[8] Там жа. Спр. 27, арк.79.

[9] Там жа. Ф. 845, воп.1, спр. 21, арк. 93.

[10] Судебный процесс по делу о злодеяних немецко-фашистских захватчиков на территории Украинской ССР // Советская Белоруссия. 1946, 29 января. С. 3.

[11] НАРБ. Ф. 4п, воп. 29, спр. 6, арк. 44-45.

[12] Шарков А.В. Архипелаг ГУПВИ: военнопленные и интернированные на территории Беларуси: 1944—1951 гг. Мн., 2003. С. 128.

[13] НАРБ. Ф. 4п, воп. 61, спр. 228, арк. 99.

[14] Шаркоў А. Генералы вермахта ў палоне// Беларускі гістарычны часопіс. 2006, № 1. С. 9.

[15] Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы / Сост. В.И.Адамушко, Г.Д.Кнатько, Н.Е.Калесник, В.Д.Селеменев, Н.А.Яцкевич. Под. ред. Г.Д.Кнатько. Мн., 2003. С.129-130.

[16] Судебный процесс по делу о злодеяниях, совершенных немецко-фашистскими захватчиками в Белорусской ССР (15—29 января 1946 г.). Мн., 2010. С. 414.

[17] НАРБ. Ф. 4п, воп. 29, спр. 111, арк. 21.

[18] Судебный процесс по делу о злодеяниях, совершенных немецко-фашистскими захватчиками в Белорусской ССР (15—29 января 1946 г.). С. 11.

[19] Там жа.

[20] Там жа. С. 127.

[21] Там жа. С. 184.

[22] Там жа. С. 381-382.

[23] Шарков А.В. Архипелаг ГУПВИ: военнопленные и интернированные на территории Беларуси: 1944—1951 гг. С. 133.

[24] Карнер С. Архипелаг ГУПВИ: пленные и интернированные в Советском Союзе: 1941—1956 гг. / Пер. с нем. О.Асписовой. М., 2002. С. 43—49.

[25] Там жа. С. 202.

[26] Шарков А.В. Архипелаг ГУПВИ: военнопленные и интернированные на территории Беларуси: 1944—1951 гг. С. 133.

[27] Карнер С. Архипелаг ГУПВИ: пленные и интернированные в Советском Союзе: 1941—1956 гг. С. 202.

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ